
У фондах Расійскага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва ў Маскве захоўваюцца сотні малюнкаў Іосіфа Ігіна — яго сяброўскія шаржы на Чынгіза Айтматава, Міхаіла Аляксеева, Анатоля Алексіна, Маргарыту Алігер, Мухтара Ауэзава, Віталія Біянкі, Юрыя Бондарава, Мірзо Турсун-задэ і многіх іншых творцаў.



Яшчэ адно зямляцкае пахаванне на Ваганькаўскіх могілках. **Віталій Ігнатавіч КІЛЬЧЭЎСКІ** (1899—1986) нарадзіўся ў Ліпнішках Іўеўскага раёна, на Гродзеншчыне. Рускі савецкі артыст оперы (лірычны тэнар). Заслужаны артыст РСФСР. У час службы ў Чырвонай Арміі пачаў выступаць у мастацкай самадзейнасці. У 1932 г. паступіў у Трэці музычны тэхнікум у Ленінградзе. Па класе спеваў займаўся ў прафесара Соф'і Уладзіміраўны Акімавай у Ленінградскай кансерваторыі. Разам з Паўлам Лісіцыным і Леанідам Лаўроўскім удзельнічаў у стварэнні пры кансерваторыі маладзёжнага опернага тэатра. З 1944 г. выступаў у Ленінградскім тэатры оперы і балета імя С. М. Кірава (зараз Марыінскі тэатр). Шмат гастраляваў па СССР і замежных краінах (Чэхаславакія, Балгарыя, ГДР). Узнагароджаны за творчыя дасягненні ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў.



Гомельская Ветка — радзіма рускага паэта, перакладчыка Дзмітрыя **Міхайлавіча КАВАЛЁВА** (1915—1977). Бацька будучага паэта — вясковы каваль. Скончыўшы чацвёрты клас, Дзмітрый пачаў працаваць памагатым у кузні. У 1934 г. паступіў у Гомельскі вячэрні рабфак Мінскага політэхнічнага інстытута. Скончыўшы яго з адзнакай, паступіў на завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Ленінградскага ўніверсітэта. У той час вельмі захапляўся паэзіяй С. Ясеніна. У 1938—1939 гг. Кавалёў працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе вёскі Раманавічы ў Гомельскім раёне. Друкавацца пачаў у «Полесской правде», затым у газеце «Сталинская молодежь». У студзені 1941 г. Д. Кавалёва прызвалі на службу ў Ваенна-Марскі Флот. Патрапіў на Поўнач. Быў чырванафлотцам, стралком марской пяхоты. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баявых паходах падводных лодак, працаваў у франтавым друку Паўночнага флоту, быў літаратурным супрацоўнікам газеты «Краснофлотец», сакратаром рэдакцыі газеты «Боевой курс». Пасля дэмабілізацыі жыў і працаваў у Льгове (Курская вобласць, Расія), Мінску. У беларускай сталіцы пабачыла свет і першая кніга паэзіі Д. Кавалёва «Далёкие берега», у якую ўвайшлі ваенныя вершы паэта. У Мінску пабачылі свет некалькі кніг ураджэнца Веткі: следам за першым зборнікам — яшчэ кнігі паэзіі «Стихи», «Мы не расстаемся», «Рябиновые ночи»,